**Каляндар знамянальных і памятных дат Капыльшчыны на 2025 год**

ЮБІЛЕІ
герояў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, воінаў-інтэрнацыяналістаў

14 лютага - **110 год** з дня нараджэння **Наржымскага Уладзіміра Аляксандравіча,** Героя Савецкага Саюза, ваеннага лётчыка, вучонага ў галіне ваенных навук, педагога, узнагароджанага ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ураджэнца вёскі Цімкавічы (14.02.1915-17.10.1988).

Чэрвень - **115 год** з дня нараджэння **Жыжыка Івана Клеменцьевіча**, аднаго з кіраўнікоў і арганізатараў партызанскага руху на Міншчыне, ураджэнца вёскі Навасёлкі Цімкавіцкага сельскага Савета (1910-12. 08.1943).

9 чэрвеня - **120 год** з дня нараджэння **Емельянава Ніла Дзянісавіча**, кіраўніка партызанскага руху, сакратара Капыльскага падпольнага райкома партыі ( 09.06.1905-1988).

8 лістапада - **60 год** з дня нараджэння **Міхалковіча Генадзя Васільевіча**, воіна – інтэрнацыяналіста, ураджэнца вёскі Мацкевічы Блеўчыцкага сельскага Савета (08.11.1965-15.07.1985).

10 снежня - **115 год** з дня нараджэння **Нячаева Арсена Аляксеевіча**, Героя Савецкага Саюза, капітана Савецай Арміі, удзельніка штурма Берліна, ураджэнца вёскі Блеўчыцы (10.12.1910-07.04.1989).

24 снежня - **105 год** з дня нараджэння **Ляшчынскага Адама Браніслававіча**, Героя Савецкага Саюза, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, камандзіра батарэі самаходных установак СУ-122, ураджэнца вёскі Якубавічы Капыльскага сельскага Савета (24.12.1920-08.09.2006).

ЮБІЛЕІ
Герояў Сацыялістычнай Працы

1 студзеня - **110 год** з дня нараджэння **Нікульскай Ганны Гаўрылаўны**, Героя Сацыялістычнай Працы, жывёлавода племзавода імя Дзяржынскага (01.01.1915- ?).

ЮБІЛЕІ
навуковых дзеячаў

4 студзеня - **190 год** з дня нараджэння **Наркевіча-Ёдкі Вітольда Аляксандравіча**, вядомага афтальмолага, аўтара навуковых прац у

галіне хваробы вачэй, ураджэнца вёскі Камсамольскае (04.01.1835-24.11.1924).

16 студзеня - **95 год** з дня нараджэння **Янушкі Анатоля Давыдавіча**, вучонага-лесавода і эканаміста, доктора сельскагаспадарчых навук (1994), прафесара (1978), ураджэнца вёскі Цялядавічы (16.01.1930-2008).

8 красавіка - **75 год** з дня нараджэння **Кандраценкі Уладзіміра Сцяпанавіча**, расійскага вучонага ў галіне тэхналогіі прэцэзійнай апрацоўкі шматфункцыянальных матэрыялаў, доктара тэхнічных навук, прафесара, акадэміка Акадэміі інжынерных навук, ураджэнца вёскі Слабодка Стаўбцоўскага раёна, дзіцячыя і юнацкія гады якога прайшлі на Капыльшчыне, скончыў СШ №2 г. Капыля (08.04.1950).

13 красавіка - **70 год** з дня нараджэння **Шаціла Яраслава Сяргеевіча**, расійскага вучонага ў галіне эксплуатацыі ракетнай тэхнікі і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій, ураджэнца г. Капыля (13.04.1955).

15 красавіка - **120 год** з дня нараджэння **Гурвіча Наума Лазаравіча**, савецкага вучонага – кардыёлага і рэаманітолага, заснавальніка практычнай імпульснай дэфібрыляцыі сэрца, доктара медыцынскіх навук (1956), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1970), ураджэнца вёскі Цімкавічы (15.04.1905-25.02.1981).

15 мая - **95 год** з дня нараджэння **Янава Аляксандра Паўлавіча,** савецкага вучонага ў галіне горнай справы, бяспекі працы і экалогіі, доктара тэхнічных навук (1973), прафесара (1974), ураджэнца вёскі Астравок Доктаравіцкага сельскага Савета (15.05.1930- 20.09.1987).

4 чэрвеня - **120 год** з дня нараджэння **Гурскага Мікалая Іванавіча**, беларускага мовазнаўцы, кандыдата філалагічных навук (1950), прафесара (1962), удзельніка партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчынай вайны, ураджэнца вёскі Лугавая Бабаўнянскага сельскага Савета (04.06.1905-05.07.1972).

17 ліпеня - **90 год** з дня нараджэння **Лінніка Івана Адамавіча**, беларускага геолага, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тэхнікі (1986), ураджэнца вёскі Русакі Слабадакучынскага сельскага Савета (17.07.1935-16.05.2012).

20 ліпеня- **110 год** з дня нараджэння **Багдановіча Міхаіла Мітрафанавіча**, савецкага і расійскага вучонага ў галіне гіграскапічных і навігацыйных прыбораў, доктара тэхнічных навук (1960), прафесара (1965), ураджэнца г. Капыля (20.07.1915-13.02.1984).

11 жніўня - **120 год** з дня нараджэння **Скрыгана Аляксандра Іосіфавіча**, беларускага хіміка, доктара хімічных навук (1966), прафесара (1968), ураджэнца вёскі Труханавічы Грозаўскага сельскага Савета (11. 08. 1905- 28.08.1981).

12 жніўня - **65 год** з дня нараджэння **Карпілені Мікалая Васільевіча**, расійскага вучонага ў галіне ваеннай бяспекі, ураджэнца вёскі Дзярэчына Блеўчыцкага сельскага Савета (12.08.1960).

13 кастрычніка – **200 год** з дня нараджэння **Красоўскага Людвіга Якаўлевіча**, расійскага вучонага і ўрача - практыка ў галіне інфекцыйных хвароб і эпідэміялогіі, ураджэнца вёскі Грозава (12.10.1825-28.01.1906).

31 кастрычніка - **135 год** з дня нараджэння **Бельскага Фамы Антонавіча,** вучонага ў галіне педагогікі і псіхалогіі, краязнаўцы, музеёлага, педагога, літаратуразнаўцы, прафесара (1925), ураджэнца вёскі Цімкавічы (31.10.1890-02.03.1952).

11 лістапада - **125 год** з дня нараджэння **Багдановіча Міхаіла Ануфрыевіча,** беларускага вучонага ў галіне тэрапеўтычнага лячэння і прафілактыкі ўнутраных і інфекцыйных хвароб, арганізатара аховы здароўя і медыцынскай адукацыі, які ў 1933-1934 гг. быў дырэктарам Беларускага медыцынскага інстытута, ураджэнца г. Капыля (11.11.1900-15. 07.1942).

15 снежня - **115 год** з дня нараджэння **Далгіна Ісаака Маркавіча**, вучонага-метэаролага, доктара геаграфічных навук (1964), ураджэнца вёскі Цімкавічы (15.12.1910 - 21.06.1988).

28 снежня - **130 год** з дня нараджэння **Ката Сцяпана Аляксеевіча**, беларускага і расійскага вучонага ў галіне раслінаводства, фізіялогіі і абароны раслін, доктара сельскагаспадарчых навук (1951), ураджэнца вёскі Пясочнае (28.12.1895- ?).

2025 - **110 год** з дня нараджэння **Тароцькі Уладзіміра Іосіфавіча,** ваеннага інжынера-канструктара танкаў, які працаваў на Ленінградскім Кіраўскім заводзе, ураджэнца вёскі Рымашы (1915-2002).

## ЮБІЛЕІ

паэтаў, пісьменнікаў, дзеячаў мастацтва, служыцелей царквы

21 студзеня - **185 год** з дня нараджэння **Паперна Абрама-Якава (Аўраама) Ізраілевіча,** яўрэйскага паэта, літаратурнага крытыка, літаратуразнаўцы, публіцыста, педагога, ураджэнца г. Капыля (23.01.1840-1919).

22 лютага - **105 год** з дня нараджэння **Коршака Аляксея Ігнатавіча**, беларускага паэта, ураджэнца вёскі Закопанка Доктаравіцкага сельскага Савета (22.02.1920-27.02.1945).

23 сакавіка - **130 год** з дня нараджэння **Сташэўскага Васіля Пятровіча**, беларускага пісьменніка, ураджэнца вёскі Лугавая Бабаўнянскага сельскага Савета (23.03.1895-29.10.1937).

23 красавіка - **95 год** з дня нараджэння **Шуміліна Міхаіла Міхайлавіча**, беларускага кампазітара, аўтара песень на словы беларускіх паэтаў (“Мяцеліца”, “Мінскі вальс”, “Край мой любы”), ураджэнца вёскі Кукавічы Цімкавіцкага сельскага Савета (23.04.1930-1960).

24 чэрвеня - **125 год** з дня нараджэння **Кузьмы Чорнага**, беларускага пісьменніка, драматурга, публіцыста, стваральніка беларускай псіхалагічнай і філасофскай прозы, які нарадзіўся ў вёсцы Боркі-Бялевічы Капыльскага раёна (24.06.1900-22.11.1944).

2 ліпеня - **140 год** з дня нараджэння **Пастэрнацкага Уладзіміра**, настаяцеля царквы вёскі Пясочнае, затым г. Капыля, рэпрэсіраванага ў 1936

годзе, прылічанага да ліку святых новапакутнікаў Беларускай Праваслаўнай Царквы (02.07.1885-05.01.1938).

28 ліпеня - **120 год** з дня нараджэння **Дубовіка Міколы**, беларускага паэта, ураджэнца вёскі Каменка Капыльскага сельскага Савета (28.07.1905 - 30.06.1928).

14 жніўня - **100 год** з дня нараджэння **Міхальчука Сяргея Апанасавіча,** беларускага дзіцячага пісьменніка, перакладчыка, заслужанага работніка культуры Беларусі (1972), ураджэнца вёскі Скабін Капыльскага сельскага Савета (14.08.1925-19. 07.1995).

15 кастрычніка -**150 год** з дня нараджэння **Клейнбарта Льва Максімавіча**, пісьменніка, крытыка, публіцыста і журналіста, ураджэнца г. Капыля (15. 10. 1875-20.11.1950).

2 лістапада - **105 год** з дня нараджэння **Чарніковіча Парфёна Парфёнавіча,** расійскага майстра разьбы па косці, народнага мастака Расійскай Федэрацыі, творы якога захоўваюцца ў Дзяржаўным Эрмітажы, Дяржаўным русскім музеі, Усерасійскім музеі дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва, а таксама перададзены ў музеі ЗША, Германіі, Фінляндыі, ураджэнца вёскі Страхіні Бучацінскага сельскага Савета (02.11.1920-14.03.2011).

14 лістапада - **125 год** з дня нараджэння **Чарнушэвіча Нічыпара Тодаравіча**, беларускага паэта, ураджэнца г. Капыля (14.11.1900-18.02.1967).

16 лістапада - **120 год** з дня нараджэння **Янкі Скрыгана**, беларускага пісьменніка, ураджэнца вёскі Труханавічы Грозаўскага сельскага Савета (16.11.1905-18.09.1992).

17 лістапада - **100 год** з дня нараджэння **Ясючэні Уладзіміра Мікалаевіча**, беларускага паэта, ураджэнца вёскі Станькі Доктаравіцкага сельскага Савета (17.11.1925-12.03.1945).

2025 - **150 год** з дня нараджэння **Даманскай Міхаліны Адамаўны**, класіка польскай літаратуры, ураджэнкі вёскі Чыжэвічы Доктаравіцкага сельскага Савета (1875-18.03.1936).

## У 2025 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:

11 студзеня - **45 год** з дня адкрыцця **сярэдняй школы №3** (Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №3”) (11.01.1980).

28 лютага - **25 год** як Дзяржаўная геральдычная служба, згодна з Пастановай Савета Міністраў “Аб Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь” №89 ад 22. 02. 1994 года **зарэгістравала і ўнесла ў Гербавы матрыкул Герб горада Капыля 1952 года** (28.02.2000).

3 мая - **95 год** з дня як пачала выходзіць **раённая газета “Слава працы**” (03.05.1930).

18 жніўня - **35 год** з дня адкрыцця **Капыльскага фізкультурна-аздараўленчага комплекса** (18.08.1990).

| | |
|---|---|
| 25 жніўня - | **105 год** з дня заснавання **МАУП “Доктаравічы”** (раней саўгас “Доктаравічы”) (25.09.1920). |
| 1 верасня - | **45 год** як адкрылася **Капыльскае СПТВ-211** і 25 год як вучылішча стала **ліцэем** (01 09.1980, 1.09.2000). |
| 1 верасня - | **60 год** як адкрылася **Доктаравіцкая сярэдняя школа** (01.09.1965) |
| верасень - | **20 год** з дня адкрыцця **Цэнтра ткацтва** ў вёсцы Семежава (2005, верасень). |
| 1 кастрычніка - | **95 год** як была створана **Капыльская МТС** (01.10.1930) |
| 2025 - | **210 год** як у Капылі адкрылася **першая царкоўна - прыходская школа** (1815). |
| 2025- | **60 год** з дня заснавання **СВК “Цімкавіцкі”** (раней калгас “Цімкавіцкі”, зараз далучаны да ААТ “Капыльскае”) (1965). |

Пры складанні спіса “Старонкі гісторыі Капыльшчыны” былі выкарыстаны наступныя матэрыялы:


1. Беларуская энцыклапедыя: У18 т. – Мінск.: БелЭн, 1996. – 2002
2. Беларусь: энцыкл. даведнік. – Мінск: БелЭн, 1995.- 799 с.
3. Бельскі, А. Тут іх карані і вытокі: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў свеце.- Мінск: Рэдакцыя часопіса “Роднае слова”, 2014..- 71 с.
4. Бельскі, А. Тут наша радзіма: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў Беларусі і свеце / Алесь Бельскі. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2018. -152 с.
5. Бельскі, А. Тут жыцця пачатак: вядомыя людзі з Капыльшчыны / Алесь Бельскі. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2021. – 128 с.
6. Минская область: энциклопедия в 2 т.- Мінск: БелЭн, 2007
7. Памяць: Капыльскі раён: гісторыка-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Бел навука, 2001. - 638 с.
8. Звесткі з установы “Дзяржаўны занальны архіў” г. Слуцк.



*Каляндар складзены метадыстам аддзела бібліятэчнага маркетынга ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі” Н. А. Гурло*